КІНО

# З когорты першых

Большасць гледачоў, якім адрасаваны гэты фільм аб'яднання «Летапіс» студыі «Беларусьфільм», убачаць жывое аблічча гэтага чалавека ўпершыню. Яго імя — у назве адной з вуліц Мінска, школы ў Пухавіцкім раёне. Аб яго жыцці і рэвалюцыйнай дзейнасці можна прачытаць у кнігах. Есць музейныя экспанаты, звязаныя з ім. У руху, у непасрэдных кантактах з сялянамі і рабочымі, у дзяржаўных актах і на дыпламатычным рауце — такога рухавага, з добрай усмешкай, уважлівага і шчырага — толькі кінаэкран паказвае Аляксандра Рыгоравіча Чарвякова так уражліва. Аўтары фільма, які называецца па радку дакумента, падпісанага старшынёй Саўнаркома У. І. Леніным, — «Чарвякову... тэрмінова... Ленін», вывучалі архіўныя матэрыялы старанна і пільна: дзелавыя паперы, пратаколы і дэпешы, здымкі прафесійных фатографаў і кінакадры рэпарцёраў хронікі. Выкадроўкі і стоп-кадры набліжаюць да сучаснага гледача аблічча палымянага рэвалюцыянера і савецкага дзяржаўнага дзеяча, каб мы адчулі прывабнасць гэтай асобы — не як выключэння, а як аднаго з многіх людзей, закліканых і мабілізаваных на барацьбу за народную справу.

Так, вядома, што на I Усесаюзным з'ездзе Саветаў 30 снежня 1922 года была прынята Дэкларацыя аб стварэнні СССР і аб'яднанні ў ім РСФСР, Украінскай ССР, Беларускай ССР і ЗСФСР на падставе добраахвотнасці і раўнапраўя. Пад гэтым гістарычным дакументам подпіс ад Беларусі — А. Чарвякова. Старшыня ЦВК і СНК БССР, ён гаварыў тады, звяртаючыся да дэлегатаў: «Працоўныя Беларусі будуць ганарыцца, калі вы прымеце нашу прапанову, дзякуючы чаму рабочыя і сяляне Беларусі стануць адным з першых атрадаў працоўных, якія ўступаюць у ствараемы Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік».

Хто ж ён быў, які ён быў, гэты чалавек, якому камуністы, працоўныя рэспублікі даверылі абвясціць гэту волю, гэты намер? Экран як бы прапануе нам: паглядзіце кадры, дзе захавана яго аблічча зусім непасрэдна. Калі кінуць вокам на так званае «генеалагічнае дрэва», то карані асобы — ад дзеда, які быў прыгонным, ад бацькі, які выбіўся ў пісары. Адукацыйны цэнз — Віленскі настаўніцкі інстытут. З 1915 года — вайсковая служба. Пісьменны, адукаваны прапаршчык А. Чарвякоў — дарадчык, сябра, настаўнік для салдат. Фатаграфіі захоўваюць вельмі разумны, такі сумленна адкрыты выраз твару чалавека, які сам вывучае законы грамадскага развіцця не толькі, як сказана паэтам, «па Гегелю», а ў акопах першай сусветнай вайны, у асяроддзі такіх жа, як сам ён, людзей у салдацкім шынялі, з ружжом у руках. Класавая праўда — яго праўда, яго перакананні, яго светапогляд. І зусім не выпадкова ў тую векапомную кастрычніцкую ноч, калі рэвалюцыйныя атрады штурмуюць Зімні палац, Аляксандр Чарвякоў сярод атакуючых. Кулямётная рота пад яго камандаваннем — актыўны ўдзельнік падзей у Петраградзе 1917 года.

Здаецца, сам прынцып пабудовы такога дакументальнага фільма, калі аўтары ў асноўным прытрымліваюцца хаалагічнай паслядоўнасці і як бы гартаюць старонкі біяграфіі героя, — не новы. Здаецца, сцэнарысты У. Мехаў і Ю. Цвяткоў і рэжысёр Ю. Цвяткоў толькі адно і робяць, што затрымліваюць нашу ўвагу на новых кінадакументальных матэрыялах, якія ўстаўлены ў мантажную паслядоўнасць з раней вядомымі хранікальнымі эпізодамі часоў рэвалюцыі, грамадзянскай вайны, вайны супроць інтэрвентаў... Не, ёсць у фільма «Чарвякову... тэрмінова... Ленін» яшчэ адна якасць: ён будуецца як паэтычнае светаўспрыманне праз лёс аднаго чалавека, як спроба па-філасофску асэнсаваць біяграфію героя.

Буйныя кадры — партрэт А. Чарвякова. Інтэлект і адухоўленасць. Добразычлівасць і валявая непахіснасць. Мудрая дабрыня і шчодрасць душы. У мантажным сказе такія кадры займаюць не больш як пяць метраў, ды яны шмат аб чым гавораць нам, бо мы самі ў думках як бы «дамалёўваем» постаць чалавека, які свядома і самаададана выбраў свой лёс рэвалюцыянера, стаў ленінцам і ўсім жыццём пацвердзіў шчырасць свайго выбару мэты і сэнсу барацьбы за светлыя ідэалы.

Асабліва каштоўныя знаходкі аўтараў стужкі і аператара В. Купрыянава — кадры хронікі, дзе мы бачым А. Чарвякова сярод людзей. На з'ездах і сходах, на новабудоўлях, з калгаснікамі. Рабоча-сялянскі прэзідэнт Савецкай Беларусі часта вырашаў надзённыя справы на месцы — на заводзе, у калгасе, на будоўлі. Знітаванасць партыйнага дзеяча, дзяржаўнай асобы з народам не дэкларуецца дыктарскім тэкстам, а паказваецца на экране. І зноў буйныя кадры — А. Чарвякоў на трыбуне разам з Усесаюзным старастам М. І. Калініным, з Маршалам Савецкага Саюза С. М. Будзённым, з народным паэтам Беларусі Янкам Купалам...

Тактоўна і выразна ўводзяцца ў стужку кадры з У. І. Лені-



Кадр з фільма: А. Р. Чарвякоў сярод калгаснікаў. 1936 г.

Барыс БУР'ЯН.

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы